Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце
БДУКМ
___________ В. Р. Языковіч
«___» __________ 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ____/вуч.

# ХАРЭАГРАФІЧНЫ АНСАМБЛЬ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках),*
*напрамкаў спецыяльнасці*
*1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец),*
*1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец),*
*1-17 02 01-10 Харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2019

Вучэбная праграма састаўлена на аснове адукацыйнага стандарту – Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках), на падставе вучэбных планаў:
С 17-1-79/17 вуч. (народны танец),
С 17-1-81/17 вуч. (эстрадны танец),
С 17-1-82/17 вуч. (сучасны танец)


**СКЛАДАЛЬНІК**
*С. В. Гуткоўская,* загадчык кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат філалагічных навук, дацэнт



**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*М. В. Філатава,* загадчык кафедры сцэнічнай мовы, вакалу і пластычных дысцыплін установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», дацэнт;
*Н. М. Хадзінская,* дацэнт кафедры тэорыі музыкі і музычнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
кафедрай харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 17.05.2018);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 21.06.2018)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: С. В. Гуткоўская


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Харэаграфічны ансамбль» з'яўляецца важнай часткай прафесійнага навучання спецыялістаў у галіне харэаграфічнага мастацтва.

Праграма вучэбнай дысцыпліны знаходзіцца ў цеснай узаемасувязі з вучэбнымі дысцыплінамі «Мастацтва балетмайстра», «Класічны танец», «Народна-сцэнічны» і «Эстрадны танец», «Сучасны танец», прадугледжваючы практычнае ўвасабленне набытых на дадзеных дысцыплінах ведаў, напрацоўку навыкаў і ўменняў ва ўмовах мадэлявання дзейнасці харэаграфічнага ансамбля.

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны «Харэаграфічны ансамбль» – падрыхтоўка спецыялістаў-харэографаў, якія здольны арганізаваць творчую дзейнасць танцавальнага калектыву на высокім прафесійным узроўні.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– засваенне метадаў работы з удзельнікамі харэаграфічнага ансамбля;

– развіццё і ўдасканальванне практычных навыкаў і ўменняў па арганізацыі і правядзенні пастановачнай і рэпетыцыйнай работы ў танцавальным калектыве;

– авалоданне навыкамі работы з канцэртмайстрам і фанаграмай;

– развіццё артыстычнасці і танцавальнай выразнасці пры выкананні харэаграфічных твораў;

– набыццё пэўных навыкаў сцэнічнай практыкі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя этапы пастановачнай работы харэографа ў працэсе стварэння танцавальнага твора;

– прынцыпы арганізацыі пастановачнага і рэпетыцыйнага працэсу ў харэаграфічным калектыве;

– асаблівасці падбору выканаўцаў для танцавальнага нумара;

– формы і метады арганізацыі работы пастаноўшчыка і рэпетытара з канцэртмайстрам і фанаграмай;

*умець:*

– арганізоўваць і здзяйсняць пастановачны і рэпетыцыйны працэс у харэаграфічным калектыве;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– адбіраць харэаграфічныя творы для фарміравання канцэртнага рэпертуару калектыву з улікам яго накіраванасці;

– вылучаць стылістычныя асаблівасці і змест мастацкага вобраза танцавальнага твора;

– працаваць з канцэртмайстрам;

– выкарыстоўваць фанаграму;

– улічваць фізічныя асаблівасці і творчую індывідуальнасць выканаўцаў падчас пастановачнага і рэпетыцыйнага працэсу.

*Метады і тэхналогіі навучання*

Эфектыўнымі педагагічнымі прыёмамі навучання з'яўляюцца выкарыстанне метаду аналізу канкрэтных сітуацый, метад рэйтынгавай ацэнкі ведаў, варыятыўнай, камунікатыўнай, праектнай і іншых тэхналогій, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі вопыту вырашэння задач у іх будучай дзейнасці.

Засваенне адукацыйнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Харэаграфічны ансамбль» павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-4. Валодаць навыкамі здаровага ладу жыцця.

САК-6. Умець працаваць у камандзе.

САК-8. Праяўляць ініцыятыву і крэатыўнасць, у тым ліку ў нестандартных сітуацыях.

САК-10. Фарміраваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю.

САК-11. Актыўна ўдзельнічаць у творчых мерапрыемствах як мясцовага, так і агульнанацыянальнага значэння.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

ПК-1. Выконваць харэаграфічную лексіку розных відаў танца.

ПК-2. Валодаць акцёрскім майстэрствам для стварэння мастацкіх вобразаў.

ПК-3. Працаваць з рознымі крыніцамі для стварэння рэпертуару, літаратурай па харэаграфіі.

ПК-5. Узаемадзейнічаць са спецыялістамі сумежных профіляў.

ПК-7. Ведаць рэпертуар харэаграфічнага калектыву і валодаць методыкай яго выканання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-9. Здзяйсняць мастацкую задуму сцэнічнага твора ў аматарскіх і прафесійных харэаграфічных калектывах рознай накіраванасці.

ПК-10. Ажыццяўляць пастаноўку ўласных харэаграфічных твораў, працаваць з выканаўцамі над харэаграфічным тэкстам і ўдасканальваннем тэхнікі выканання і пластычнай выразнасці.

ПК 11. Планаваць і праводзіць усе віды рэпетыцый, узаемадзейнічаць са стваральнікамі харэаграфічнага твора па забеспячэнні высокага мастацкага ўзроўню пастановак.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Харэаграфічны ансамбль» усяго адведзена 346 гадзін, з якіх 228 гадзін – аўдыторныя заняткі (2 гадзіны – лекцыі, 226 гадзін – практычныя заняткі).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Харэаграфічны ансамбль». Роля і значэнне вучэбнай дысцыпліны ў падрыхтоўцы спецыяліста-харэографа. Узаемасувязі вучэбнай дысцыпліны «Харэаграфічны ансамбль» з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва». Патрабаванні да студэнтаў пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

### *Тэма 1. Фарміраванне рэпертуару харэаграфічнага калектыву (народнага танца, эстраднага танца, сучаснага танца)*

Асноўныя прынцыпы фарміравання рэпертуару харэаграфічнага калектыву. Стварэнне рэпертуару ў адпаведнасці з мастацкай накіраванасцю калектыву, складам яго ўдзельнікаў. Улік тэхнічных магчымасцей і акцёрскай індывідуальнасці ўдзельнікаў калектыву пры стварэнні танцавальных нумароў.

### *Тэма 2. Тэматычныя канцэртныя праграмы*

Стварэнне тэматычных канцэртных праграм – галоўная мастацкая мэта кіраўніка харэаграфічнага калектыву. Адбор харэаграфічных кампазіцый для фарміравання канцэртнага рэпертуару ансамбля: сольных, камерных, масавых твораў рознай тэматычнай накіраванасці і з розным складам удзельнікаў.

### *Тэма 3. Работа па стварэнні антуражных танцаў*

Асаблівасці пастаноўкі антуражнага танца на песенны музычны матэрыял. Прынцыпы кампазіцыйнай пабудовы антуражных нумароў. Прыёмы распрацоўкі пластычных лейтматываў у антуражным танцы. Стварэнне сцэнічнай кампазіцыі з удзелам выканаўцаў вакальных партый. Выкарыстанне пластычнага патэнцыялу вакаліста, для якога ствараецца антураж. Работа над сінхроннасцю і выразнасцю выканання танцавальнага тэксту.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 4. Арганізацыя пастановачнага працэсу ў харэаграфічным калектыве (народнага танца, эстраднага танца, сучаснага танца)*

Асноўныя этапы пастановачнай работы харэографа ў працэсе стварэння танцавальнага твора. Прынцыпы арганізацыі пастановачнага працэсу. Асаблівасці падбору выканаўцаў для канкрэтнага танцавальнага нумара з улікам знешніх, фізічных дадзеных, тэхнічных і акцёрскіх магчымасцей.

### *Тэма 5. Пастановачная работа з выканаўцамі сольных партый і антуражам*

Асаблівасці работы з выканаўцамі сольных партый і антуражам. Прынцыпы адбору выканаўцаў для сольных партый: улік творчай індывідуальнасці, ступені эмацыянальнай выразнасці і тэхнічнай падрыхтоўкі. Індывідуальная работа з салістамі і антуражам.

### *Тэма 6. Работа пастаноўшчыка і рэпетытара з канцэртмайстрам*

Асноўныя прынцыпы сумеснай работы харэографа і канцэртмайстра. Формы і метады арганізацыі плённай работы пастаноўшчыка і рэпетытара з канцэртмайстрам. Сумесная работа харэографа-пастаноўшчыка з канцэртмайстрам па аналізе і складанні схемы музычнага твора.

### *Тэма 7. Работа харэографа з фанаграмай*

Асноўныя прынцыпы работы харэографа з фанаграмай. Асаблівасці работы з фанаграмай падчас пастановачнай і рэпетыцыйнай работы ў харэаграфічным ансамблі. Прынцыпы мантажу музычнай фанаграмы ў адпаведнасці з мастацкай задумай харэаграфічнага твора.

### *Тэма 8. Рэпетыцыйная работа ў харэаграфічным ансамблі*

Рэпетыцыя – асноўная форма падрыхтоўкі канцэртных праграм і асобных нумароў шляхам шматразовых паўтарэнняў (цалкам і часткамі) пад кіраўніцтвам харэографа. Прынцыпы арганізацыі рэпетыцыйнага працэсу ў танцавальным калектыве. Методыка вядзення рэпетыцыйнай работы ў харэаграфічным ансамблі. Паступовае развучванне танцавальных рухаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у розных тэмпах, пачынаючы з павольнага, у адпаведнасці з правіламі музычнай раскладкі.

### *Тэма 9. Рэпетыцыйная работа з выканаўцамі сольных партый*

Асаблівасці рэпетыцыйнай работы з выканаўцамі сольных партый. Улік творчай індывідуальнасці, ступені эмацыянальнай выразнасці і тэхнічнай падрыхтоўкі выканаўцаў сольных партый падчас рэпетыцый.

### *Тэма 10. Рэпетыцыйная работа з антуражам*

Асаблівасці рэпетыцыйнай работы з антуражам. Выхаванне пачуцця партнёра і ансамбля. Асаблівасці адпрацоўкі ўнісоннага выканання танцавальнай лексікі і малюнкаў з антуражам.

### *Тэма 11. Асноўныя прынцыпы арганізацыі і правядзення генеральнай рэпетыцыі*

Генеральная рэпетыцыя – пробнае выкананне канцэртнай праграмы або асобных нумароў на сцэнічнай пляцоўцы. Асаблівасці арганізацыі рэпетыцыйнага працэсу як папярэдняй работы непасрэдна перад канцэртным выступленнем. Правядзенне рэпетыцыі ў касцюмах і са сцэнічным асвятленнем.

### *Тэма 12. Спецыфіка выканання танцавальных нумароў на розных сцэнічных пляцоўках*

Методыка скарачэння ўдзельнікаў танцавальнага нумара ва ўмовах выступлення на невялікай па памерах сцэне. Асаблівасці выканання нумара ва ўмовах шматузроўневай сцэнічнай пляцоўкі, на адкрытым паветры пры адсутнасці куліс і г. д.

### *Тэма 13. Работа над танцавальнай тэхнікай, выразнасцю і музычнасцю выканання харэаграфічных твораў*

Удасканаленне знешняй і ўнутранай тэхнікі выканання харэаграфічных нумароў. Асэнсаванне стылістычных асаблівасцей і зместу мастацкага вобраза танцавальнага твора. Выкананне кожнага нумара на высокім тэхнічным і мастацкім узроўні. Роля выканальніцкай практыкі на канцэртах, конкурсах і фестывалях у фарміраванні прафесійнага майстэрства студэнта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 14. Методыка ўвядзення новых выканаўцаў у танцавальны нумар*

Спецыфіка арганізацыі рэпетыцыйнага працэсу пры ўвядзенні новых выканаўцаў у падрыхтаваны раней нумар. Індывідуальная работа рэпетытара з новымі выканаўцамі. Самастойная работа студэнтаў пры вывучэнні тэксту танцавальнага нумара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя заняткі | | |
| **Уводзіны** | 2 | | | |
| ***Тэма 1.*** Фарміраванне рэпертуару харэаграфічнага калектыву (народнага танца, эстраднага танца, сучаснага танца) | | 16 | 4 | пісьмовае апытанне |
| ***Тэма 2.*** Тэматычныя канцэртныя праграмы | | 18 | 4 | канспект |
| ***Тэма 3.*** Работа па стварэнні антуражных танцаў | | 12 | 2 | выкананне вывучаных танцавальных нумароў |
| ***Тэма 4.*** Арганізацыя пастановачнага працэсу ў харэаграфічным калектыве (народнага танца, эстраднага танца, сучаснага танца) | | 22 | 4 | выкананне вывучаных танцавальных нумароў |
| ***Тэма 5.*** Пастановачная работа з выканаўцамі сольных партый і антуражам | | 18 | 4 | выкананне вывучаных танцавальных нумароў |
| ***Тэма 6.*** Работа пастаноўшчыка і рэпетытара з канцэртмайстрам | | 14 | 2 | вуснае апытанне |
| ***Тэма 7.*** Работа харэографа з фанаграмай | | 16 | 4 | рэферат |
| ***Тэма 8.*** Рэпетыцыйная работа ў харэаграфічным ансамблі | | 18 | 4 | выкананне творчага задання |
| ***Тэма 9.*** Рэпетыцыйная работа з выканаўцамі сольных партый | | 12 | 2 | выкананне творчага задання |
| ***Тэма 10.*** Рэпетыцыйная работа з антуражам | | 18 | 4 | выкананне творчага задання |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ***Тэма 11.*** Асноўныя прынцыпы арганізацыі і правядзення генеральнай рэпетыцыі | | 20 | 4 | рэферат |
| ***Тэма 12.*** Спецыфіка выканання танцавальных нумароў на розных сцэнічных пляцоўках | | 14 | 2 | вуснае апытанне |
| ***Тэма 13.*** Работа над танцавальнай тэхнікай, выразнасцю і музычнасцю выканання харэаграфічных твораў | | 18 | 4 | удзел у канцэртах у якасці выканаўцаў |
| ***Тэма 14.*** Методыка ўвядзення новых выканаўцаў у танцавальны нумар | | 10 | 2 | выкананне вывучаных танцавальных нумароў |
| **Усяго…** | **2** | **180** | **46** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Бухвостова, Л. В.* Балетмейстер и коллектив : учеб. пособие / Л. В. Бухвостова, Н. И. Заикин, С. А. Щекотихина. – Орел : ОГИИК, 2007. – 248 с.

2. *Безуглая Г. А.* Музыкальный анализ в работе педагога-хореографа: учеб. пособие. – СПб. : Лань : Планета музыки, 2015. – 272 с.

3. *Борзов, А. А.* Танцы народов мира / А. А. Борзов. – М. : Университет Натальи Нестеровой, 2006. – 496 с.

4. *Зарипов, Р. С.* Драматургия и композиция танца: взгляд из зрительного зала / Р. С. Зарипов. – Новосибирск : Наука, 2008. – 340 с.

5. *Захаров, Р. В.* Работа балетмейстера с исполнителем / Р. В. Захаров. – М. : Искусство, 1967. – 65 с.

6. *Кириллов, А. П.* Мастерство хореографа: учеб. пособие для студентов хореографических отделений вузов культуры и искусств / А. П. Кириллов. – М. : МГУКИ, 2006. – 154 с.

7. *Смирнов, И. В.* Искусство балетмейстера / И. В. Смирнов. – М. : Просвещение, 1986. – 192 с.

8. *Уральская, В. И.* Рождение танца / В. И. Уральская. – М. : Сов. Россия, 1982. – 115 с.

9. *Холопова, В. Н.* Форма музыкальных произведений : учеб. пособие / В. Н. Холопова. – СПб. : Лань, 1999. – 122 с.

*Дадатковая*

1. *Гуткоўская, С. В.* Стварэнне сцэнічнай кампазіцыі на аснове харэаграфічнага і музычнага фальклору / С. В. Гуткоўская, Н. М. Хадзінская. – Мінск : БДУК, 2000. – 100 с.

2. *Захаров, Р. В.* Сочинение танца. Страницы педагогического опыта / Р. В. Захаров. – М. : Искусство,1983. – 237 с.

3. *Лопухов, Ф. В.* Хореографические откровенности / Ф. В. Лопухов. – М. : Искусство, 1972. – 215 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Моисеев, И. А.* Я вспоминаю. Гастроль длиною в жизнь / И. А. Моисеев. – М. : Согласие, 1996. – 224 с.

5. *Пуртова, Т. В.* Танец на любительской сцене (ХХ век: достижения и проблемы) / Т. В. Пуртова. – М. : Гос. рос. дом нар. творчества, 2006. – 168 с.

6. *Савин, В. З.* Создание сценической хореографии на материале народного творчества: метод. пособие / В. З. Савин. – Минск : Респ. науч.-метод. центр нар. творчества и культ.-просвет. работы, 1987. – 215 с.

7. *Уральская, В. И.* Природа танца / В. И. Уральская. – М. : Сов. Россия, 1981. – 128 с.

8. *Чурко, Ю. М.* Линия, уходящая в бесконечность / Ю. М. Чурко. – Минск : Полымя, 1999. – 224 с. : ил.

9. *Чурко, Ю. М.* Белорусский хореографический фольклор: традиции и современность / Юлия Чурко ; вступ. ст. С. В. Гутковской. – Минск : Четыре четверти, 2016. – 388 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці**

1. Метады практычнай дыягностыкі (выкананне вывучаных танцавальных нумароў).
2. Рэфераты на тэмы, звязаныя з вывучаемым матэрыялам.
3. Вуснае і пісьмовае (тэсціраванне) апытанне студэнтаў для кантролю тэарэтычных ведаў.

**Формы і змест самастойнай работы студэнтаў**

1. Вывучэнне базавай літаратуры – падручнікаў, перыядычных спецыялізаваных выданняў, канспектаванне вывучанай літаратуры.
2. Рэфераты на тэму аналізавання рэпертуару вядучых прафесійных і аматарскіх харэаграфічных калектываў.
3. Наведванне канцэртных выступленняў у якасці гледачоў.
4. Удзел у канцэртах, конкурсах і фестывалях у якасці выканаўцаў.
5. Прагляд разнастайных канцэртаў, конкурсаў і творчых праектаў з інтэрнэт-крыніц.

**Прыкладныя заданні для кіруемай самастойнай работы**

1. Падрыхтоўка да практычных заняткаў.
2. Пошук дэманстрацыйнага матэрыялу (канцэртаў танцавальных калектываў) у бібліятэцы, фанатэцы, у Internet.
3. Напісанне справаздачы па выніках наведвання канцэртных праграм, конкурсаў, фестываляў і творчых праектаў.
4. Выкананне творчага задання на зададзеную тэму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ХАРЭАГРАФІЧНЫ АНСАМБЛЬ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках),*
*напрамкаў спецыяльнасці*
*1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец),*
*1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец),*
*1-17 02 01-10 Харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2019. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,87. Ул.-выд. арк. 0,42. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ